**А.А.Макарава,** *дацэнт*

# РЭГІЯНАЛІЗАЦЫЯ ЯК АСНОВА ФУНКЦЫЯНАЛЬНА-СТРУКТУРНАГА РЭФАРМАВАННЯ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ

Разглядаючы функцыянальна-структурныя пераўтварэнні ў дзейнасці клубных устаноў у адпаведнасці з патрабаваннямі часу, мы зыходзім з таго, што гэты працэс можа ажыццяўляцца эфектыўна пры ўмовах, калі ўстановы ў сваёй дзейнасці засвойваюць і развіваюць рэгіянальныя этнакультурныя традыцыі, улічваюць асаблівасці сучасных сацыякультурных патрэбнасцей насельніцтва кожнага этнарэгіёна, кіруюцца мэтамі і задачамі дакладна вызначанай рэгіянальнай культурнай палітыкі.

Трэба адзначыць, што ў мінулыя дзесяцігоддзі пры выпрацоўцы культурнай палітыкі ў адносінах да клубнай ўстановы не браліся пад увагу этнарэгіянальныя традыцыі і мясцовыя звычаі. Арганізацыя дзейнасці клубных устаноў не прадугледжвала ўліку суадносін традыцыйнай народнай культуры і інавацыйных тэхналогій сацыякультурнай дзейнасці, тым больш, што народныя традыцыі захоўваліся галоўным чынам на ўзроўні этнарэгіёнаў краіны.

З пункту гледжання сучаснай тэорыі сацыякультурнай дзейнасці паняцце «рэгіён» разглядаецца не толькі ў якасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, але і як сацыякультурная цэласнасць, дзе адносна лакальна працякаюць культурныя працэсы. У Беларусі адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне і сацыякультурная дыферэнцыяцыя часта не супадаюць. Тут мы абапіраемся на распрацоўкі беларускіх этнографаў і фалькларыстаў адносна вызначэння асноўных «этнагнёздаў» [1, с.153].

Пры выяўленні сучасных сацыякультурных патрэбнасцей насельніцтва рэгіёнаў Беларусі нельга не ўлічваць, што з'явы народнай культуры, будучы перададзенымі індывіду іншымі членамі сацыяльнай групы, засвойваюцца ім з ранняга дзяцінства і

адыгрываюць рашаючую ролю ў фарміраванні яго духоўна-маральнага складу. «Традыцыі, якія бытуюць у рэгіёнах, уяўляюць сабой вельмі дынамічную сацыяльна-культурную сістэму, у якой пры захаванні ўстойлівай, пастаяннай асновы яны змяняюцца, прыстасоўваючыся да сучасных умоў. Праз традыцыйную народную культуру ў сацыяльнай групе адбываецца ўзаемаабмен індывідуальным і калектыўным вопытам» [3, с.74].

Для традыцыйнай культуры характэрна «неразрыўнасць адаптыўна-утылітарнага, рэгулятыўнага, абрадава-рытуальнага і творчага аспектаў духоўна-практычнага засваення чалавекам рэчаіснасці». Увогуле традыцыйная народная культура – «унікальны сродак назапашвання, адбору, кансервацыі і трансляцыі вопыту асваення навакольнага свету ва ўсім яго шматабліччы»[3, с.74]. У працэсе гэтага асваення фарміруюцца сацыяльныя мадэлі паводзін, у якіх замацоўваюцца каштоўнасныя арыентацыі, эталоны і правілы, выхаваўчыя прынцыпы і інш. Адпаведна пастаяннае паўтарэнне гэтых паводзін і формаў рэагавання перарастае ў традыцыю ці ўвасабленне пераймальнай сутнасці ідэй, маральных нормаў, формаў мастацтва, зносін, культуры быту і вольнага часу.

Менавіта «ў ладзе жыцця апрадмечваюцца найбольш устойлівыя характарыстыкі быцця той ці іншай культурнай групы: вераванні, прыметы, традыцыі, арганізацыя паўсядзённага жыцця, гаспадарчы ўклад і да т.п. У фарміраванні ладу жыцця надзвычай важную ролю адыгрывае сацыяльны і асабліва нацыянальны менталітэт, што, між іншым, садзейнічае адасобленасці культур і перашкаджае кантакту паміж імі» [5, с.113].

Тым не менш пры арганізацыі дзейнасці культурных устаноў на гэтыя абставіны да цяперашняга часу не звяртаецца неабходнай увагі. Адчуваецца недахоп канкрэтна-сацыялагічных даследаванняў асаблівасцей этнарэгіянальнай ментальнасці насельніцтва Беларусі, якія праяўляюцца ў структуры патрэбнасцей насельніцтва і адпаведна ў дзейнасці ўстаноў культуры па іх задавальненні.

Нельга не пагадзіцца з меркаваннем, што менавіта традыцыйная культура ў сучасных сацыякультурных умовах выступае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў якасці дзейснай сістэмы сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання і адукацыі. У працэсе гістарычнага развіцця «беларускі этнас набыў свае асаблівасці, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне і існуюць у такіх адносна ўстойлівых формах, як мова, традыцыі, абрады, народная творчасць, этнічная самасвядомасць, тапаніміка, культура, лад паўсядзённага жыцця і г.д.» [4, с.15].

«Традыцыйная культура», як вызначаюць гэта паняцце сучасныя беларускія даследчыкі Г.Б.Варфаламеева і А.М.Боганева, – «матэрыяльныя і нематэрыяльныя віды мастацкай творчай дзейнасці народа (абрады, музыка, танцы, песні, проза, вераванні, промыслы, рамёствы, касцюм і да т.п.) у іх спрадвечным выглядзе, якія сфарміраваліся ў той ці іншай мясцовасці і маюць выразны нацыянальна-лакальны каларыт» [6, с.1–3]. Гэты від традыцыйнай мастацкай культуры, які існуе ў натуральным вясковым асяроддзі, мае старажытныя карані, перадаецца з пакалення ў пакаленне вусным шляхам, выяўляецца праз носьбітаў фальклору (спевакоў, музыкаў, танцораў, казачнікаў, майстроў, знаўцаў мясцовых традыцый і звычаяў).

Вынікі, атрыманыя беларускімі вучонымі ў ходзе этнаграфічных даследаванняў у розных рэгіёнах Беларусі, дазваляюць зрабіць выснову, што культурны ландшафт нашай краіны вельмі неаднародны. З улікам комплексу этнакультурных прымет: экалагічнага асяроддзя, традыцыйнай гаспадаркі, жылля, адзення, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, мясцовых гаворак, фальклорнай творчасці, асаблівасцей этнічнай гісторыі, гісторыка-культурных сувязей і інш. – беларускія этнографы і фалькларысты вызначаюць шэсць асноўных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: Паазер'е, Усходняе Палессе, Заходняе Палессе, Падняпроўе, Панямонне, Цэнтральная Беларусь [1, с. 153; 2, с. 7–15]. Разам з тым даследчыкі падкрэсліваюць, што ўжо «першыя спробы навуковага вывучэння рэгіянальных асаблівасцей пацвердзілі полікультурную прыроду беларускага грамадства як на ўзроўні канкрэтна-сацыялагічных даследаванняў, так і на ўзроўні дасле-

даванняў фальклорных асаблівасцей у розных рэгіёнах рэспублікі» [7, с.104–106].

Наша даследаванне, праведзенае пад навуковым кіраўніцтвам доктара сацыялагічных навук А.І.Ляўко, пацвердзіла наяўнасць значных адрозненняў у структуры сацыяльна-культурных патрэбнасцей насельніцтва этнаграфічных рэгіёнаў Паазер'я, Усходняга Палесся і Панямоння, якія ў асноўным тэрытарыяльна адпавядаюць Віцебскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцям. Сацыялагічнае даследаванне гэтых патрэбнасцей у іх цеснай сувязі з іншымі якасцямі асобы дазволіла атрымаць эмпірычны матэрыял для вызначэння характэрных этнарэгіянальных асаблівасцей [7,с.105]. Адзначым, што ў працэсе апытання розных катэгорый вясковых і гарадскіх жыхароў гэтых абласцей выкарыстоўваліся тры анкеты: «Культурныя патрэбнасці насельніцтва і іх задавальненне ў сферы вольнага часу», анкета клубнага работніка, анкета наведвальніка клуба. Анкетаванне дапамагло выявіць, што рэгіянальныя асаблівасці ў значнай меры вызначаюць не толькі структуру і характар працоўнай і сацыякультурнай дзейнасці, але і структуру працоўнага і вольнага часу. Напрыклад, розныя віды сельскагаспадарчай працы, якія характарызуюцца ўзаемадзеяннем з прыродай, найбольш характэрныя для жыхароў Віцебскай вобласці. Яны ў меншай ступені схільныя бессэнсоўна бавіць свой вольны час. Вольны ад асноўнай дзейнасці час накіроўваюць на развіццё аматарскага садаводства і агародніцтва, запаўняюць рознымі відамі рукадзелля і рамесніцтвам на даму.

Патрэба ў працы з людзьмі, уключаючы выхаванне і навучанне дзяцей, бытавое абслугоўванне, арганізацыю і кіраванне калектывам, гандаль і эканоміку, ахову здароўя, больш за ўсё праяўляецца ў жыхароў Гомельскай вобласці. Гэта адлюстравана ў ніжэйпрыведзенай табліцы. Праца са знакавымі сістэмамі і тэхнікай найбольш характэрная для жыхароў Гродзенскай вобласці. У адпаведнасці з гэтай арыентацыяй яны больш чытаюць, маюць больш выяўленую патрэбнасць у тэхнічнай творчасці і авалоданні тэхнічнымі ўменнямі і навыкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арыентацыя на розныя тыпы працы ў названых абласцях сведчыць аб істотных адрозненнях існуючых тут культурных традыцый. Так, сельскі характар культуры, які адлюстроўвае адносіны «чалавек–прырода», найбольш яскрава праяўлецца ў Віцебскай вобласці (рэгіёне Паазер'я). Адносіны «чалавек – сацыяльная група» з'яўляюцца вызначальнымі для жыхароў Гомельскай вобласці, дастаткова характэрнымі для насельніцтва рэгіёнаў Усходняга і Заходняга Палесся. Гэта і накладвае свой адбітак на арыентацыю насельніцтва вобласці выконваць працоўныя функцыі, звязаныя з падтрымкай адпаведных адносін з іншымі людзьмі, залежнасцю ад іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Арыентацыя насельніцтва рэгіёнаў краіны на розныя тыпы працы**

| Тыпы працы | Доля насельніцтва, занятая ў пэўным тыпе працы, % | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Агульна-рэспубліканскія паказчыкі | Віцебская вобл. | Гомельская вобл. | Гродзенская вобл. |
| 1. Дзейнасць, звязаная з добраўпарадкаваннем асяроддзя: догляд жывёлы, хатніх раслін і інш. | 27,8 | 35,4 | 23,9 | 25,5 |
| Праца з людзьмі: выхаванне і навучанне дзяцей, бытавое абслугоўванне, арганізацыя і кіраванне | 47,8 | 45,5 | 52,7 | 48,2 |
| Праца з тэхнікай | 13,1 | 11,6 | 10,3 | 13,5 |
| Дзейнасць, у якой аб'ектам працы з'яўляецца знакавая сістэма: работа з камп'ютэрамі, кнігамі, справаводства, сувязь і інш. | 13,2 | 8,9 | 13,0 | 17,1 |
| Мастацкая праца: рамёствы, жывапіс, архітэктура, скульптура, літаратура і інш. | 12,9 | 10,9 | 14,2 | 13,1 |

У рэгіёне Панямоння, наадварот, назіраецца тэндэнцыя пазбегнуць гэтай залежнасці, кіравацца не калектыўнымі нормамі групы, а сваімі, уласнымі патрэбнасцямі і інтарэсамі і ў залежнасці ад іх будаваць адносіны з іншымі людзьмі. Найбольш значнымі для жыхароў Гродзенскай вобласці выступаюць адносіны «чалавек–чалавек».

Гэта, у сваю чаргу, накладвае адбітак на адпаведныя патрэбнасці ў арганізацыі вольнага часу, характар кантактаў паміж людзьмі. Зносіны ў межах сям'і, з роднымі і суседзямі, частае наведванне клубаў і Дамоў культуры больш за ўсё характэрна для жыхароў Віцебскай вобласці. Зносіны з іншымі людзьмі на ўзроўні вуліцы, квартала, зносіны з суседзямі па доме і двары, бацькамі і настаўнікамі, тыповыя для гарадской, а не вясковай культуры, характэрныя для жыхароў Гродзенскай вобласці.

Падтрымка цесных кантактаў з прадстаўнікамі розных сацыяльных груп (тэрытарыяльных, прафесійных, зямляцкіх) найбольш характэрна для жыхароў Гомельскай вобласці. Асоба тут актыўна шукае адпаведную сацыяльную групу, добраахвотна прымае яе сацыяльныя нормы паводзін. Усё гэта стварае сваю, асаблівую прастору сацыяльна-культурных зносін і прастору працоўнага і вольнага часу.

Намі таксама высветлена, што аб'ём вольнага часу ў жыхароў розных рэгіёнаў неаднолькавы. Так, напрыклад, пяць і больш гадзін вольнага часу штодзённа маюць 11,2% насельніцтва Віцебскай вобласці; 17,9% – насельніцтва Гомельскай вобласці і 24,1% – насельніцтва Гродзенскай вобласці. І, наадварот, амаль не маюць вольнага часу каля 30,4% жыхароў Віцебскай вобласці; 21,1% – Гомельскай вобласці і 17,5% – Гродзенскай вобласці. Адпаведна адрозніваецца і запаўненне вольнага і працоўнага часу. Сістэматычных наведвальнікаў клубных устаноў у Віцебскай вобласці прыкладна на 10% больш, чым у іншых абласцях. Не наведваюць гэтыя ўстановы тут толькі 26,3%, у той час як у Гродзенскай вобласці – 7,9, а ў Гомельскай – 43,2% апытаных. Затое чытаюць не менш як 2–3 кнігі ў месяц 29,3% апытанага на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сельніцтва Віцебскай вобласці; 30,7% – Гомельскай і 36,6% – Гродзенскай вобласці. Не паспяваюць чытаць кнігі 15,8% насельніцтва Гомельскай вобласці, 14,9 – Віцебскай і 10,3% – Гродзенскай.

Такім чынам, як сведчаць вынікі нашага даследавання, сацыякультурныя патрэбнасці насельніцтва Беларусі дэтэрмінаваны рэгіянальна-пасяленчымі асаблівасцямі, маюць глыбокую абумоўленасць культурна-гістарычнымі традыцыямі і захоўваюцца ў сучасных праяўленнях светапогляду, ладзе жыцця, адносінах да працы, адносінах з іншымі, а таксама ў выбары формаў і відаў сацыякультурнай дзейнасці ва ўмовах нерэгламентаванага, пазапрацоўнага і вольнага часу. Так, розныя віды сельскагаспадарчай працы, якія характарызуюцца ўзаемадзеяннем з прыродай, найбольш характэрныя для жыхароў Віцебскай вобласці. Вольны час яны запаўняюць рознымі відамі рукадзелля і рамесніцтвам на даму. Нават вольныя ад асноўнай дзейнасці гадзіны яны накіроўваюць на развіццё аматарскага садаводства і агародніцтва часцей, чым жыхары іншых рэгіёнаў.

Патрэбнасць у калектыўнай працы, у актыўных формах зносін, калектыўнай творчасці, уключаючы выхаванне і навучанне дзяцей, ахову здароўя і іншае больш за ўсё праяўляецца ў жыхароў Гомельскай вобласці. Патрэбнасць у працы з тэхнікай найбольш характэрная для жыхароў Гродзенскай вобласці. У адпаведнасці з гэтай арыентацыяй яны больш чытаюць, маюць больш выражаную патрэбнасць у тэхнічнай творчасці. У жыхароў Міншчыны праяўляюцца ў роўнай ступені самыя розныя патрэбнасці: ва ўзаемадзеянні з прыродай, да зносін на аснове захапленняў, у працы са знакавымі сістэмамі і тэхнікай.

Такім чынам, мы можам сцвярджаць, што культурна-гістарычныя традыцыі асноўных этнарэгіёнаў (Паазер'я, Панямоння, Палесся, Падняпроў'я, Цэнтральнай Беларусі) прадвызначаюць змест, структуру і характар сацыякультурнай дзейнасці насельніцтва ва ўмовах вольнага часу. Сучасныя сацыякультурныя патрэбнасці насельніцтва абумоўлены этнатрадыцыямі і вы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ступаюць у якасці галоўнага арыенціра пры вызначэнні характару і зместу дзейнасці клубнай установы канкрэтнага рэгіёна.

Час патрабус далейшай распрацоўкі палітыкі ў сферы культуры і вольнага часу з улікам спецыфікі кожнага з рэгіёнаў. Тут яшчэ шмат пытанняў, якія патрабуюць глыбокага даследавання з прыцягненнем шырокага кола спецыялістаў сферы культуры, адукацыі, эканомікі, юрыспрудэнцыі і інш. Неабходна дэталёвая распрацоўка генеральных напрамкаў і прыярытэтаў сацыяльна-культурнага развіцця кожнага з рэгіёнаў нашай краіны.

---

1. *Этнаграфія* Беларусі: Энцыкл. / Рэд. І. Шамякін, М.Бандарчык і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.

2. *Першы* міжнародны фестываль фальклору. – Мн.: БелІПК, 1994. – 115 с.

3. *Потребности* в кадрах социокультурной деятельности: состояние и перспективы изучения: Материалы Всерос. науч.-метод. конф. (Казань, 2000 г.). – Казань, 2001. – 118 с.

4. *Смятаннікаў В.С.* Беларусазнаўства: Вучэб.-метад. дапам. для выкладчыкаў сярэд.спец. навуч.устаноў. – Мн.: Беларуская навука, 2000. – 149 с.

5. *Есин А.Б.* Введение в культурологию: основные понятия культурологии в систематическом изложении: Учеб. пособие для студ. высш. учеб.заведений. – М.: Издат. центр «Академия», 1999. – 216 с.

6. *Варфаламеева Т.Б., Боганева А.М.* Рэкамендацыі па ахове, захаванні, пераемнасці і папулярызацыі беларускага аўтэнтычнага фальклору.– Мн.: БелДІПК, 2001.– 12 с.

7. *Социокультурные* факторы формирования личности ученика общеобразовательной школы /Отв. ред. А.И. Левко. – Мн.: Нац. ин-т обр., 1999. – 267 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ